УДК 392.51+392.4(476)

# СВАЯЦКІЯ АДНОСІНЫ ПАДЧАС ВЯСЕЛЬНАГА АБРАДУ НА БЕЛАРУСКІМ ПАЛЕССІ (другая палова XIX - першая палова XX ст.)

*І.С. ЧАРНЯКЕВІЧ*
*(Гродзенскі дзяржаўны універсітэт)*

*На падставе багатага этнаграфічнага матэрыялу (значная частка якога друкуецца ўпершыню) асвятляюцца пытанні фарміравання сваяцкіх адносін падчас вясельнага абраду на Беларускім Палессі. Асобная ўвага звяртаецца на рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці абрадавых дзеянняў. Не з'яўляючыся асноўнай функцыяй вясельнага абраду, складванне сваяцкіх адносін прасочваецца ў многіх вясельных рытуалах.*

Як вядома, галоўным прызначэннем вясельнага абраду з'яўляецца наданне новага статусу «цэнтральным персанажам» - маладым людзям, што бяруць шлюб. Аднак шлюб у традыцыйным вясковым грамадстве ніколі не быў справай індывідуальнай. Гэта было справай сямейнай, паколькі асоба ў такім грамадстве ўспрымалася як член пэўнай сямейнай арганізацыі, а месцам сям'і ў вясковай іерархіі абумоўлівалася і месца асобы ў супольнасці [1, с. 194]. Такім чынам, шлюб у тагачасным вясковым асяроддзі - гэта не толькі і не столькі саюз двух людзей, колькі яшчэ адзін вузельчык у дапікатнай сетцы сваяцкіх і роднасных повязяў, што інтэгравалі гэтае грамадства. Такі стан характэрны для палескай вёскі яшчэ ў другой палове XIX - пачатку XX ст., а ў пэўнай ступені і ў міжваенны перыяд.

Нічога дзіўнага, што ў тагачасным вясельным абрадзе мы назіраем ярка выражаную лінію складвання сваяцкіх адносін паміж сем'ямі бяручых шлюб, уключэння аднаго з маладых (традыцыйна жанчыны) у новую сям'ю. У гэтым артыкуле мы імкнемся прасачыць менавіта гэтую лінію ў вясельных рытуалах, звяртаючы асаблівую ўвагу на лакальную рознасць палескіх вясельных звычаяў.

Уплыў сям'і на матрыманіяльныя справы сваіх членаў дае сябе адчуць асабліва моцна на этапе выбару вясковай моладдзю сабе пары. Выбар гэты, па большасці, знаходзіўся ў кампетэнцыі старэйшых членаў сям'і, і ў першую чаргу бацькоў. Тое, што пачуцці жаніха і нявесты ў разлік не браліся, успрымалася як штосьці натуральнае і рэдка аспрэчвалася. Хаця намінальна маладыя мелі права выбару па меншай меры ў большасці лакальных традыцый Палесся. Калі-нікалі хлопец і дзяўчына нават карысталіся гэтым правам. Э. Еленьска піша, што «пры заключэнні шлюбу вельмі рэдка ў разлік бярэцца ўзаемная сімпатыя. Бацькі дамаўляюцца паміж сабой за пасрэдніцтвам сватоў, а ў той дамоўленасці найбольшую ролю адыгрываюць дастатак, працавітасць, цвярозасць, а не ўзаемная схільнасць заінтарэсаваных старон. Трэба разумець, што як з аднаго, так і з другога боку прымусу не ўжываюць; пытаюць нават дзяўчыну, ці згодна з выбарам бацькоў, і калі яна сапраўды не хоча за яго ісці, то заўсёды зможа адмовіць. Але гэта здараецца рэдка. Часцей за ўсё дзяўчына яшчэ вельмі маладая, каб кіравацца ўласным розумам, давярае бацькам і падпарадкоўваецца іх волі» [2, с. 326].

Згодна з сучаснымі палявымі даследаваннямі, у першай палове XX ст. выбар шлюбнай пары бацькамі сустракаецца на ўсёй тэрыторыі Беларускага Палесся, хаця ўжо і не з'яўляецца выключнай іх кампетэнцыяй. У значнай частцы выпадкаў маладыя ў гэты перыяд ужо самі выбіралі сабе жонку альбо мужа. Сведчанні на гэтую тэму самыя разнастайныя. І сярод палявых матэрыялаў мы знаходзім дадзеныя на карысць як адной, так і другой мадэлі паводзін.

Традыцыйна комплекс вясельных рытуалаў пачынаецца са сватання. У многіх вёсках на даследуемай тэрыторыі зафіксаваны і звычай хаджэння жанчыны, прадстаўніцы сям'і патэнцыяльнага жаніха, да дому мяркуемай навесты, з мэтай даведацца аб намерах дзяўчыны, а галоўнае, яе бацькоў. У залежнасці ад лакальнай традыцыі адведванне гэтае насіла назву «пэрэвідкі», «пэрэвід», абмен хлебам («хлеб маці памяняла»). Зафіксавана яно на тэрыторыі Жыткавіцкага (г. Тураў), Столінскага (вескі Плотніца, Гальцы, Верхні Церабяжоў), Пінскага (вескі Калавуравічы, Ласіцк, Клетная), Іванаўскага (вёска Моталь), Драгічынскага (вёска Радастава) раёнаў [3, с. 29] (вескі Плотніца, Гальцы, Калавуравічы)[1]. У Кобрынскім раёне звычай гэты сустракаецца пад назвай «запытыны» альбо «допыты» (вёскі Аніскавічы, Грушава [4, с. 482], вёска Аніскавічы[2]). Ёсць сведчанні аб фіксацыі цырымоніі - «пярэпыты», - якая папярэднічала сватанню, у вёсцы Стралічава Хойніцкага р-на [5, с. 8].

Само сватанне было справай пераважна мужчынскай, хаця жанчыны таксама маглі ўдзельнічаць у гэтай цырымоніі. На ролю галоўнага свата (у цэнтральных і заходніх рэгіёнах Беларускага Палесся ён часцей за ўсё насіў назву «дружко») запрашалі звычайна хроснага бацьку жаніха, альбо іншага жанатага родзіча, што карыстаўся павагай у вёсцы. Часам ролю галоўнага свата на этапе сватання выконваў родны

бацька маладога [3, с. 31; 6, с. 17]. Галоўнае прызначэнне гэтага этапу - атрыманне прынцыповай згоды бацькоў дзяўчыны і фармальнай згоды яе самой на шлюб з канкрэтным прэтэндэнтам.

Першыя крокі, зробленыя на ўзгаданых этапах абраду, мелі свой працяг на заручэнні ці запоінах (канчатковай дамоўленасці аб маючым адбыцца вяселлі). Тэрмін «запоіны» для абазначэння канчатковай дамоўленасці сустракаецца практычна ва ўсіх варыянтах, распаўсюджаных у заходняй і цэнтральнай частках Беларускага Палесся. Спарадычна, ад тэрыторыі Кобрынскага р-на з захаду і далей на ўсход па ўсёй даследуемай тэрыторыі сустракаецца і тэрмін «заручэнне», ці «заручыны», у якасці тэрміну, што дубліруе папярэдні альбо абазначае толькі частку адзначаных рытуалаў (вёскі Сварынь Драгічынскага р-на, Моладава, Дастоева Іванаўскага р-на, Лобча Лунінецкага р-на, Верасніца, Пухавічы Жыткавіцкага р-на [7, с. 25]; вёскі Верасніца, Пухавічы[1]; Сварынь, Моладава, Дастоева[3]). У якасці назвы самастойнага этапу вяселля гэты тэрмін тут не зафіксаваны. Ва ўсходнім Палессі дамінуе тэрмін «заручэнне», ці «заручыны», хаця сустракаецца і назва «запоіны» ў якасці самастойнай (вёскі Валаўск Ельскага р-на, Левашы Рэчыцкага р-на) [5, с. 56; 8, с. 176] альбо дубліруючай (вёска Сякерычы Петрыкаўскага р-на) [9, ф. 8, воп. 83, спр. 211, сш. 2, л. 80]. У гэтым жа рэгіёне сустракаюцца і некаторыя іншыя назвы разглядаемай часткі абраду, якія на Беларускім Палессі ў гэтай якасці больш не сустракаюцца. Так, у некаторых вёсках усходняга Палесся для абазначэня этапу канчатковай дамоўленасці паміж сем'ямі прэтэндэнтаў служыць тэрмін «змовіны» (вёскі Малейкі Брагінскага р-на, Глінішчы Хойніцкага р-на, Галоўчыцы Нараўлянскага р-на) [5, с. 64; 9, ф. 7, воп. 1, спр. 883, лл. 36, 23], у іншых - «магарыч» (вёскі Калыбань, Савічы Брагінскага р-на) [5, с. 28; 12].

Такая рознасць тэрміналогіі, на наш погляд, магла быць следствам скарачэння передвясельнай часткі абраду, спалучэння ў рамках аднаго адрэзку абрадавага часу дзеянняў, якія раней выконваліся на розных этапах. Пры гэтым традыцыя ўтрымлівае ў якасці асноўнай адну назву, захаваўшы пры гэтым іншыя, якія ўжываюцца ў якасці дубліруючых альбо ўдакладняючых, а часам абазначаюць пэўную частку рытуалаў, што раней складалі асобны этап абраду. На карысць гэтай думкі сведчыць той факт, што пры дастаткова выражанай геаграфічнай прывязцы дамінуючых тэрмінаў, тэрміны «другасныя» спарадычна сустракаюцца практычна на ўсёй тэрыторыі Беларускага Палесся.

Да этапу канчатковай дамоўленасці аб заключэнні шлюбу і парадненні абедзвюх сямей звычайна прымеркаваны рытуал абвязвання прадстаўнікоў партыі жаніха палатном альбо ручнікамі ці наміткамі. Сярод іншых, рытуал гэты служыў адным з этапаў паяднання дзвюх сямей - сям'і, якая праз адорванне «сваім» палатном як бы «асвойвала» «чужакоў», і сям'і, што праз прыняцце гэтых дароў уключалася ў складваючуюся сістэму сваяцкіх адносін.

Аднак у палескай вясельнай абрадавасці гэты рытуал (як, дарэчы, і многія іншыя) меў характар «нефіксаванага» (згодна з тэрміналогіяй А.В. Гуры [10, с. 76]). У большасці варыянтах ён прымеркаваны да «заручын» ці «запоін». Тым не менш сустракаюцца сведчанні аб «навязванні» сватоў альбо аднаго свата палатном толькі ў час вяселля (вёскі Струга Столінскага р-на, Вулька Антопальская, Вулька Сіманавіцкая, Пігасы Драгічынскага р-на, Пясчаная, Моладава, Дворэц Жыткавіцкага р-на, Калыбань Брагінскага р-на [5, с. 28; 9, ф. 7, воп. 1, спр. 879, лл. 32, 49 - 50а; ф. 8, воп. 83, спр. 210, сш. 2, л. 29]; вёска Пігасы[1]; вёскі Струга, Пясчаная, Моладава[3]). У некаторых варыянтах упамінаецца абвязванне сватоў ручнікамі, наметкамі ці поясам і ў час «запоін» і «ў вяселлі» (вёскі Плотніца, Гальцы Столінскага р-на, Парэ Пінскага р-на, Буса Іванаўскага р-на)[1]. Пры гэтым палатно, атрыманае сватамі на заручынах, трактавалася не толькі як знешняя адзнака вясельнага чыну, але і як падарунак нявесты і яе сям'і. Тым больш што раздаванне палатна не заўсёды суправаджалася абвязваннем сватоў. Палатно маглі проста пакласці ў сумку (вёскі Лутное Жыткавіцкага р-на, Грушава Кобрынскага р-на) [4, с. 482; 9, ф. 8, воп. 83, воп. 217, спр. 1, л. 82 ]. У асобных варыянтах гэтыя першыя падарункі радня маладога магла атрымліваць і на іншых этапах абраду, напрыклад, пад час наведвання («оцьведаў») нявесты групай замужніх жанчын з «роду» жаніха, якое адбывалася паміж змовінамі («магарычом») і вяселлем. Пры гэтым маладая, атрымаўшы падарунак ад наведвальніц, адорвала апошніх палатном і перадавала падарункі для мужчын (веска Савічы Брагінскага р-на) [5, с. 16]. Акрамя таго, часам у якасці дару выступала не палатно, а, напрыклад, жывёлы (у вёсцы Гарадная Столінскага р-на на запоінах прынята было дарыць кожнаму са сватоў штосьці жывое, «хоць курыцу»)[1].

Рытуальныя дарэнні, адрасаваныя сваякам маладога з боку- партыі маладой, у большасці варыянтаў адбываліся яшчэ і ў доме маладога. Часам падарункі перадавалі з жаніхом, які у некаторых варыянтах пасля вянчання па невялікім застоллі ехаў па «свой род» (вёскі Кліменцінава', Аніскавічы[2], а таксама вёскі Вулька Антопальская, Вулька Сіманавіцкая Драгічынскага р-на, Аніскавічы Кобрынскага р-на, Кліменцінава Іванаўскага р-на [9, ф. 7, воп. 1, спр. 879, лл. 33, 49, 50а]). Звычайна ж маладая ці яе прадстаўніцы (чытай - прадстаўніцы яе «роду») адорвалі радню маладога на «яго» тэрыторыі, пераважна пасля раскрывання маладой - зняцця з яе палатна альбо вэлюма. Аднак сустракаюцца варыянты, у якіх падарункі прывозіла з сабою маці маладой у «прыданыя» ці «пярэзвы» (вёскі Кабёлка Брэсцкага р-на,

Бездзеж Драгічынскага р-на, Струга Столінскага р-на, Глушкавічы Лельчыцкага р-на [3, с. 72; 9, ф. 7, воп. 1, спр. 879, л. 26], вёскі Бездзеж[1], Струга[3]).

Адным з этапаў афармлення адносін сваяцтва з'яўляецца прыезд радні маладога па нявесту. На гэтым этапе прадстаўнікі партыі маладога маюць назвы:

- «баяры» ці «баярыя» (вёскі Малейкі Брагінскага р-на, Пагост Жыткавіцкага р-на, Аніскавічы Кобрынскага р-на, Галоўчыцы Нараўлянскага р-на, Азершчына Рэчыцкага р-н [5, с. 67; 8, с. 170; 9, ф. 7, воп. 1, спр. 883, л. 36а; 11, с. 396-399], вёскі Аніскавічы[2]);

- «бяседа» (вёскі Колкі, Снядзін, Дарашэвічы Петрыкаўскага р-на, Камень Пінскага р-на) [9, ф. 8, воп. 83, спр. 211, сш. 2, л. 18; 12, с. 505 - 506; 13, с. 183; 14, с. 139];

- «поезд» (вёскі Верасніца, Знаменка Жыткавіцкага р-на, Гальцы Столінскага р-на, Стадолічы Лельчыцкагар-на [9, ф. 8, воп. 83, спр. 210, сш. 1, л. 56; 15, с. 151], вёскі Знаменка, Гальцы');

- «урад» (вёскі Плотніца Столінскага р-на, Калавуравічы Пінскага р-на)[1]. Часам рэспандэнты спецыяльнага тэрміну не называюць, а акрэсляюць прадстаўнікоў жаніха як «сваты» альбо «свацце» (Парэчча, Парэ Пінскага р-на, Пухавічы Жыткавіцкага р-на, аколіцы Старобіна, Кажан-гарадок Лунінецкага р-на, Моталь, Моладава, Дастоева, Вулька Дастоеўская, Кротава, Пясчаная Іванаўскага р-на, Вулька Сіманавіцкая, Вулька Антопальская, Перкавічы, Пігасы Драгічынскага р-на, Страдзічы Брэсцкага р-на) [9, ф. 7, воп. 1, спр. 879, лл. 33, 49, 50а], вёскі Пухавічы, Кажан-Гарадок, Перкавічы, Пігасы', вёскі Парэчча, Парэ, Моталь, Моладава, Дастоева, Вулька Дастоеўская, Кротава, Пясчаная, Страдзічы[3]);

- «свадзьба» (вёскі Сякерычы Петрыкаўскага р-на, Савічы Брагінскага р-на, Велута Лунінецкага р-на) [5, с. 18; 9, ф. 8, воп. 83, спр. 211, сш. 2, л. 78; 15, с. 160], альбо «род» (вёскі Леніна, Азяраны Жыткавіцкага р-на, Махро, Буса, Кліменцінава Іванаўскага р-на, Сварынь, Хомск Драгічынскага р-на, Мацясы Жабінкоўскага р-на, Багушы Брагінскага р-на), вёскі Леніна, Азяраны, Кліменцінава, Хомск', вёскі Махро, Буса, Сварынь, Мацясы[3] [8, с. 193]).

Супроцьпастаўленне «свой - чужы», якое з азначэння прысутнічае ў вясельным рытуале, у розных лакальных палескіх традыцыях мае розную насычанасць і некаторыя адрозненні ў праяўленнях. Інтэнсіўнасць гэтага супрацьпастаўлення, найбольш яскрава выражаная ў цэнтральных і заходніх рэгіёнах, некалькі затушоўваецца ва ўсходнім Палессі. Аднак перапевы паміж свахамі, характэрныя для цэнтральных варыянтаў (напрыклад, вёскі Альшаны, Белавуша Столінскага р-на, Пагост Жыткавіцкага р-на, Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на, Калавуравічы, Ласіцк Пінскага р-на, ваколіцы Старобіна [3, с. 54], вёска Белавуша[3] [16, с. 357], вёскі Кажан-Гарадок, Калавуравічы'), пераходных ад цэнтральна-палескіх да заходнепалескіх (вёскі Моталь Іванаўскага р-на, Аніскавічы Кобрынскага р-на, вёскі Моталь[3], Аніскавічы[2]), сустракаюцца і ва ўсходнепалескіх і пераходных ад усходнепалескіх да цэнтральна-палескіх варыянтаў (напрыклад, вёскі Слабажанка Хойніцкага р-на, Сякерычы Петрыкаўскага р-на [9, ф. 8, воп. 81, спр. 184, сш. 3, лл. 38, 24, воп. 83, спр. 211, сш. 3, лл. 10, 11]. Падмацавана гэтае супрацьпастаўленне таксама асобным частаваннем «роду» маладой і «роду» маладога.

Характэрным для палескага вяселля ўвогуле з'яўляецца той факт, што маладая ніколі не ехала ў дом мужа без суправаджэння хаця б аднаго прадстаўніка свайго боку. Звычайна гэта была адна жанчына альбо невялікая група з радні, альбо сяброўак маладой. У большасці апісанняў рэспандэнты не акрэсліваюць гэтую групу ці прадстаўніка асобай назвай, аднак у некаторых варыянтах яны абазначаны спецыяльным тэрмінам, як то:

- «прыданы» ці «прыданыя» (вёскі Дружылавічы, Дастоева, Вулька Дастоеўская Іванаўскага р-на, Вулька Сіманавіцкая, Бездзеж Драгічынскага р-на, Кабёлка, Страдзічы Брэсцкага р-на, Заазернае Маларыцкага р-на [9, ф. 7, воп. 1, спр. 879, лл. 20, 26; 17, с. 273], вёска Бездзеж[1], Дастоева, Вулька Дастоеўская, Страдзічы[3]);

- «прыданка» (вёска Мацясы Жабінкаўскага р-на[3]), «прыданіца» (вёска Снедзін Петрыкаўскага р-на) [12, с. 509]; «пасцельнікі» (вёска Сякерычы Петрыкаўскага р-на) [9, ф. 8, воп. 83, спр. 211, сш. 2, л. 82], альбо «пасцельніцы» (вёскі Пухавічы, Ляхавічы Жыткавіцкагар-на)[1];

- «праваднічка» (вёскі Гальцы, Плотніца Столінскага р-на)[1];

- «касянкі» (некаторыя вёскі Нараўлянскага р-на) [18, с. 411].

Колькасць і асабовы склад прадстаўнікоў гэтай групы таксама залежаў ад лакальнай традыцыі. Звычайна рэспандэнты акрэсліваюць яе як «пару чалавек з блізкай радні», часта без вызначэння полу асоб, што складалі гэтую групу. Часам падкрэсліваецца, што ў групу, што суправаджапа нявесту, уваходзяць толькі жанчыны (паводле апісанняў з некаторых вёсак Жыткавіцкага, Драгічынскага, Нараўлянскага р-наў [5, с. 76], вёскі Азяраны Жыткавіцкага р-на, Бездзеж Драгічынскага р-на'). Некалькі апісанняў дастаўляюць болей інфармацыі, акрэсліваючы падрабязней, хто з жанчын альбо дзяўчат ехаў з маладою. Так, часта гэта былі сяброўкі нявесты. Аднак амаль усе ўпамінанні аб іх прысутнасці на гэтым этапе абраду датычаць варыянтаў заходне- і цэнтральна-палескіх (вёскі Аніскавічы Кобрынскага р-на, Пагост, Пухавічы, Знаменка Жыткавіцкага р-на, Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на, Плотніца, Струга, Гарадная

Столінскага р-на, Дружылавічы, Лядавічы, Махро, Кротава, Кліменцінава Іванаўскага р-на, Вулька Сіманавіцкая, Бездзеж, Пігасы, Ліпнікі Драгічынскага р-на[2] [9, ф. 7, воп. 1, спр. 879, л. 49; 11, с. 399; 17, с. 274]; вёскі Пухавічы, Знаменка, Кажан-Гарадок, Плотніца, Гарадная, Кліменцінава, Бездзеж, Пігасы, Ліпнікі[1]; вёскі Струга, Лядавічы, Махро, Кротава[3]). Адным з рэдкіх выключэнняў з'яўляецца апісанне з вёскі Радзін Хойніцкага р-на [5, с. 83]. Ва ўсходнепалескіх варыянтах звычайна ўпамінаецца замужняя жанчына.

Амаль заўсёды якая-небудзь болын дасведчаная жанчына ехала таксама разам з сяброўкамі маладой. Часцей за ўсё ў якасці асобы, абавязкова суправаджаючай нявесту, называецца хросная маці (вёскі Вароніна Жыткавіцкага р-на, Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на, Гарадная, Гальцы Столінскага р-на, Савічы Брагінскага р-на)' [5, с. 20] альбо/і цётка (вёскі Вароніна Жыткавіцкага р-на, Плотніца Столінскага р-на, Савічы Брагінскага р-на)[1] [5, с. 20], часам жонка брата - «браціха» (вёска Пагост Жыткавіцкага р-на) [11, с. 401] альбо замужняя сястра (вёскі Сякерычы Петрыкаўскага р-на, Пагост Жыткавіцкага р-на, Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на, Плотніца Столінскага р-на)[1] [9, ф. 8, воп. 83, спр. 211, сш. 2, л. 82; 11, с. 399].

Лакальнае распаўсюджанне мае прысутнасць у гэтай групе маладых хлопцаў (вёскі Дружылавічы, Махро, Кротава, Кліменцінава Іванаўскага р-на, Ліпнікі, Пігасы Драгічынскага р-на [17, с. 273], вёскі Махро, Кротава[3], Кліменцінава, Ліпнікі, Пігасы') альбо канкрэтна брата (вёскі Сякерычы Петрыкаўскага р-на, Пагост Жыткавіцкага р-на) [9, ф. 8, воп. 83, спр. 211, сш. 2, л. 82; 11, с. 399].

Галоўным абавязкам жанчын, што суправаджалі нявесту, было развешванне пасля прыезду ў хату маладога ручнікоў (а пазней - і фіранак), дэманстраванне прыданага (пасагу), а адначасова рукадзелля нявесты, а таксама ў некаторых лакальных традыцыях сцяленне пасцелі маладым. Апошняе зафіксавана ў вёсках Сякерычы Петрыкаўскага р-на, Вароніна, Ляхавічы Жыткавіцкага р-на, Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на, Гальцы, Струга Столінскага р-на, Вулька Сіманавіцкая, Бездзеж, Ліпнікі, Перкавічы Драгічынскага р-на, Савічы Брагінскага р-на [9, ф. 8, воп. 83, спр. 211, сш. 2, л. 82; ф. 7, воп. 1, спр. 879, л. 49], вёсках Вароніна, Ляхавічы, Кажан-Гарадок, Гапьцы, Бездзеж, Ліпнікі, Перкавічы[1], Струга[3] [5, с. 20]. У вёсцы Бездзеж Драгічынскага р-на гэтая жанчына накладвала маладой галаўны ўбор маладой[1].

Прыезд радні маладой, які адбываўся па меншай меры праз пэўны час пасля ад'езду нявесты ў дом жаніха, а звычайна на другі дзень, пасля першай шлюбнай ночы, уяўляе сабой наступны этап у крысталізацыі повязяў сваяцтва ў ходзе вяселля. Аналіз распаўсюджвання тэрміналогіі гэтага этапу, там, дзе ўдаецца яе прасачыць, паказвае наяўнасць двух тэрмінаў: «пярэзвы» і «прыдыныя». Першы тэрмін у разглядаемым значэнні бытуе на захадзе даследуемай тэрыторыі, спарадычна ўпамінаецца ў матэрыялах з цэнтральнай зоны, і ніколі - ва ўсходнім Палессі. Другі тэрмін распаўсюджаны пачынаючы ад тэрыторыі Драгічынскага і Іванаўскага р-наў (дзе ўпамінаецца спарадычна), з паступовым пашырэннем па меры прасоўвання на ўсход.

У склад гэтай групы «вясельнікаў» абавязкова ўваходзілі бацькі маладой, якія ехалі праведаць дачку ў новым доме. Прызнанне за ёю новага статуса, а таксама ролі асобы, якая аб'ядноўвала дзве сям'і (не належачы ўжо ў поўнай ступені да сваёй роднай, а адначасова толькі пачынаючай уваходзіць у сям'ю новую), сімвалічна выражалася, між іншым, і праз своеасаблівае «шуканне» маладой прадстаўнікамі яе партыі. Зафіксавана такое шуканне ў вяселлях, запісаных у асноўным у вёсках цэнтральнай частк і Беларускага Палесся: Пігасы, Ліпнікі Драгічынскага р-на, Калавуравічы Пінскага р-на, Гарадная, Гальцы Столінскага р-на[1]; Сварынь Драгічынскага р-на, Вулька Дастоеўская Іванаўскага р-на[3] [9, ф. 8, воп. 83, спр. 211, сш. 2, л. 87]. У вёсках Сварынь, Калавуравічы, Гальцы, Сякерычы, Гарадная на месцы маладых па прыездзе партыі нявесты сядзелі «пасадныя маладыя», а госці нявесты павінны былі «пазнаць» падмену. Значна шырэйшае распаўсюджанне маюць песні аб адшуканні «сваёй» маладой, якія выконваліся прадстаўнікамі партыі нявесты на самым пачатку гэтага этапу вяселля.

Трактаванне старанoй нявесты новай сям'і як чужой, а значыцца небяспечнай для нявесты, ў пэўнай ступені варожай, а ва ўсялякім разе непрадказальнай - адным словам, «несваёй» прачытваецца і ў звычаі прывозу сімвалічнага альбо рэальнага снедання для маладой сяброўкамі, прыданікамі альбо перазвянамі. Фіксуецца гэты звычай у вёсках цэнтральнага і, часткова, усходняга Палесся: Савічы Брагінскага р-на, Валаўск Ельскага р-на, Снядзін Петрыкаўскага р-на (вёскі Пігасы, Ліпнікі Драгічынскага р-на, Гарадная Століскага р-на', вёскі Сварынь Драгічынскага р-на, Струга Столінскага р-на[3]) [5, с. 22, 61; 12, с. 509]. Гэтак жа могуць быць адчытаны і просьбы «роду» маладой, адрасаваныя сватам перад ад'ездам да дому маладога. Відавочны, падобны характар мае і прывязеннё на адведванне нявесты ў яе новым доме «пірага і клубочку шоўку» (вёска Махро Іванаўскага р-на)[3], а таксама прасніцы альбо калаўротку (вёскі Бездзеж, Пігасы Драгічынскага р-на)[1].

Цесна звязанае з усталяваннем новых роднасных адносін прыняцце нявесткі ў якасці новага члена ў сям'ю мужа ў паасобных выкананнях мае свае варыяцыі, якія можна звесці да наступных. Паўсюдная цырымонія сустрэчы бацькамі мападога новага члена сям'і адбываецца з абавязковымі сімваламі дабрабыту дому - хлебам-соллю, традыцыйна падаваным на веку ад дзяжы. Да гэтых сімвалаў дадавалася гарэлка, якая пазней дзе-нідзе замянялася віном, як напрыклад, у вёсцы Заходы Рэчыцкага р-на [8, с. 191].

Часта рэспандэнты ўпамінаюць у якасці прывітальнага пачастунку мёд [9, ф. 8, воп. 83, спр. 210, сш. 2, л. 14] (вёскі Гарадная, Плотніца Сто-лінскага р-на, Леніна Жыткавіцкага р-на, Капавуравічы Пінскага р-на, ваколіцы Старобіна)[1]; (вёскі Струга Столінскага р-на, Пясчаная, Кротава Іванаўскага р-на)[3]. Даследчыкі адзначаюць, што мёд у вясельнай абраднасці меў сімволіку як ахвярную, так і пладароддзя. У гомельскім Папессі «свякруха частавала маладых мёдам - як бы прычашчала» [19, с. 66].

Для ўсходнепалескіх, а часткова і цэнтральна-палескіх варыянтаў характэрна падкрэсленасць ролі маці жаніха пры сустрэчы маладых, Выражаецца яна праз акцэнтацыю рэспандэнтаў, што менавіта «маці ўстрэчае», а таксама праз актыўную яе ролю ў гэтай цырымоніі, дзе бацька, калі і прысутнічае, то спецыяльных дзеянняў не выконвае, а толькі падкрэслівае статус маці, якая жыве ў пары, а не з’яўляецца ўдавой ці разведзенай. Падобную акцэнтацыю сустракаем у матэрыялах з вёсак Рэчыцкага, Ельскага, Петрыкаўскага, Жыткавіцкага, Столінскага, Пінскага, Іванаўскага, Драгічынскага р-наў [8, с. 191; 5, с. 59]; (вёскі Людзеневічы, Вароніна, Пухавічы, Ляхавічы, Леніна, Семурадцы Жыткавіцкага р-на'; Гарадная, Плотніца, Гальцы Столінскага р-на, Калавуравічы Пінскага р-на; вёскі Струга Столінскага р-на, Парэ Пінскага р-на, Пясчаная, Вулька Дастоеўская, Буса Іванаўскага р-на, Сварынь Драгічынскага р-на[3]) [9, ф. 8, воп. 83, спр. 210, сш. 2, л. 14, спр. 211, сш. 2, лл. 18, 83; 11, с. 400; 12, с. 509].

Як адзін з этапаў прыняцця ў сям’ю новага члена можа быць прачытаны і вынас дзяжы як прадмета з высокай ступенню семіятычнасці, звязанага з хатнім вогнішчам [20, с. 147].

У сваю чаргу нявеста, пры ўваходзе на падворак, а затым у дом як новы асяродак яе жыцця, прыносіла з сабою свае «культурныя» прадметы, якія разам з тым, што з’яўляліся сімваламі прынясення ў новы дом прыбытку, могуць быць патрактаваны як сродкі ўваходжання яе ў новую прастору, асваенне ёю гэтай прасторы. Так можа быць прачытаны звычай абсыпання зернем падворка і хаты новага месца жыхарства, кіданне сыру па хаце.

Аднак найбольш яскрава адчуваецца гэты момант у звычаі прывязення да свёкраў хлеба з дому сваіх бацькоў. Хлеб гэты нявеста аддавала маці маладога пры сустрэчы, як у вёсцы Тульгавічы Хойніцкага р-на, Лутное Жыткавіцкага р-на [5, с. 92; 9, ф. 8, воп. 83, спр. 217, сш. 1, л. 88], альбо клала на стол, печ ці комін - цэнтральныя аб’екты дома (вёскі Струга, Верхні Церабяжоў Столінскага р-на, Аніскавічы, Грушава Кобрынскага р-на, Кабёлка Брэсцкага р-на, Мацясы Жабінкаўскага р-на, Гіеркавічы, Бездзеж Драгічынскага р-на, Ападзішча Іванаўскага р-на, Пагост Жыткавіцкага р-на, Радзін Хойніцкага р-на, Заходы Рэчыцкага р-на, (вёскі Перкавічы, Бездзеж'; Аніскавічы[л]; Струга, Мацясы, Ападзішча[3]) [5, с. 83; 8, с. 191; 9, ф. 7, воп. 1, спр. 879, лл. 26, 26а; 11, с. 398]. Цікавы звычай падае інфарматар з вёскі Кліменцінава Іванаўскага р-на. Тут нявеста той хлеб, што прывезла з дому сваіх бацькоў, кладзе ў дзяжу і накрывае сурвэткаю, што азначае, як патлумачыла інфарматар, прыход у хату новай гаспадыні, якая цяпер хлеб пячы будзе'.

Падобны характар, між іншым, мела ікона, часцей за ўсё вянчальная, з якою нявеста ехала на новае месца, а таксама ручнікі альбо іншыя прадметы рукадзелля, якія маладая альбо яе прадстаўніцы развешвалі ў доме свёкраў. Найбольш увагі ў гэтым кантэксце даследчыкі прысвячаюць разгляду ролі ручнікоў, што, як лічаць, напрыклад, Л.С. Таксубаева і М.У. Зорын (у аднясенні да выкарыстання арнаментаваных ручнікоў у вяселлі рускага насельніцтва Сярэдняга Паволжа), «выконвалі ў доме мужа функцыі задобрывання духаў-продкаў яго сям’і, апекуноў роду мужа. Яны служылі своеасаблівай ахвярай гэтым духам і ў той жа час выконвалі ахоўныя функцыі ў адносінах да маладой, ствараючы добразычлівы мікраклімат у доме мужа» [21, с. 100].

Ручнік трактаваны многімі даследчыкамі як знак сямейна-радавых сувязей па жаночай лініі [22, с. 80; 23, с. 413]. У вясельным рытуале, такім чынам, замена тканага хатняга ўбранства, што належала маці маладога, на рукадзелле, прывезенае нявесткай, можа быць адчытана і як «прынясенне «праграмы» матчынага роду, вярнуўшыся лёс, сатканы дзяўчыне на ручніку» [23, с. 413]. Адначасова развешванне ручнікоў (пазней і фіранак), прывезеных з дому нявесты, у доме маладога з’яўляецца «асваеннем» нявестай новай, чужой для яе прасторы.

Выкарыстанне ручнікоў і іншых тканін на гэтым этапе вяселля ва ўказаным значэнні распаўсюджана на ўсёй тэрыторыі, ахопленнай даследаваннем. Лакальныя варыяцыі датычаць дэталяў ужывання палатняных вырабаў, прывезеных нявесткай з матчынага дому. Акрамя ручнікоў, якія ўпамінаюцца інфарматарамі ў першую чаргу і літарапьна ва ўсіх апісаннях, даволі часта сустракаюцца сведчанні аб засціланні абрусамі («настольнікамі», «настыльнікамі», «скацерцямі») сталоў у доме жаніха (вёскі Плотніца, Гальцы Столінскага р-на, Калавуравічы Пінскага р-на'; Струга Столінскага р-на, Дастоева, Вулька Дастоеўская Іванаўскага р-на[3]) [8, с. 209; 11, с. 401; 24, с. 36].

Калі-нікалі ў апісаннях з’яўляюцца сведчанні аб развешванні фіранак на вокны ў хаце маладога (вёскі Азяраны, Знаменка Жыткавіцкага р-на, Тульгавічы Хойніцкага р-на)[1] [5, с. 92]. Сведчанні гэтыя, відаць, адносяцца ўжо да сярэдзіны XX ст., паколькі ў інтэр’еры сялянскай хаты нават міжваеннага перыяду фіранкі з тканіны былі рэдкасцю.

Часам у апісаннях не называецца від вырабаў, а проста канстатуецца, што ў хаце маладога вывешвалі прыданае маладой (у апісаннях з вёсак Валаўск, Мядзведнае Ельскага р-на, Галоўчыцы Нараўлянскага р-на,. Высокае Хойніцкага р-на) [5, с. 60, 76, с. 97; 25, с. 436; параўн.: 18, с. 410].

Вар'іравалася таксама колькасць вывешваемых вырабаў, якая залежала не толькі ад заможнасці бацькоў нявесты, але і ад мясцовай традыцыі [26, с. 54]. Ручнікоў звычайна патрэбна было столькі, колькі вісела ў свекрыві ў хаце - каб кожны з іх замяніць новым. Тыя, што віселі дагэтуль, перадаваліся свекрыві [26, с. 75]. Такім чынам, нявеста альбо яе прадстаўніцы пазначалі новую жыццёвую прастору, дзе з гэтага часу маладая жанчына павінна была жыць.

Падобную семантычную нагрузку (сярод іншых значэнняў) мелі і другія прадметы альбо нават жывёлы, якія нявеста альбо прадстаўнікі яе партыі прыносілі ў новую жыццёвую прастору маладой. Звычайна гэта былі талерка і лыжка, часта госці маладога альбо маладой лавілі пеўня ці курыцу, каб на новым месцы іх выпусціць альбо прыгатаваць (вёскі Пагост Жыткавіцкага р-на, Радзін Хойніцкага р-на, Струга Столінскага р-на, Валаўск Ельскага р-на, Вулька Дастоеўская Іванаўскага р-на, Аніскавічы, Грушава Кобрынскага р-на)[1],[3] [5, с. 59; 11, с. 396].

Звычаі гэтыя зафіксаваны на ўсёй даследуемай тэрыторыі, і нават выкарыстанне паасобных аб'ектаў, як то посуд альбо курыца, немагчыма звязаць ні з адньгм з рэгіёнаў.

З другога боку, новая сям'я таксама павінна была «асвоіць» «чужую», якая прыйшла ў іх дом. Падобнае «асваенне» прачытваецца перш за ўсё ў цырымоніях вітання і «адкрывання» маладой. Менавіта ў гэтым ключы можна разглядаць выкарыстанне пад час вітання нявесткі кажуха, вывернутага воўнай наверх, магчыма, татэмічнага сімвала, які, акрамя забеспячэння дабрабыту маладой пары, выконваў і ролю сімвала «духаў» гэтага дому. На гэта ўказваюць як вербальныя яго азначэнні - свякруха «мядзведзя робіць», «бы воўк апранаецца», - так і сам ход цырымоніі сустрэчы. Выкарыстанне кажуха пры сустрэчы маладых яшчэ ў міжваенны перыяд спарадычна адзначаецца на ўсёй даследуемай тэрыторыі, акрамя раёнаў на самым захадзе Брэстчыны.

Як сведчанне «чужароднасці» нявесты і ўзаемнай небяспекі яе і новага асяроддзя можа быць патрактаваны звычай здымання маладой з воза маладым: «сама не злазіла - малады здымаў», зафіксаваны ў вёсках Хомск, Бездзеж, Пігасы, Перкавічы, Ліпнікі Драгічынскага р-на, Дастоева Іванаўскага р-на, Ляхавічы Жыткавіцкага р-на[13].

З прыняццем нявесты ў новую сям'ю, яе «асвойваннем» звязана зняцце з нявесты пакрывала ці наметкі, павязаных у доме яе бацькоў. Укрыванне палатном маладой (а часам і абоіх маладых) пры выпраўленні з д'ому нявесты распаўсюджана ў заходнепалескіх і цэнтральна-палескіх варыянтах у комплексе з накладваннем на нявесту галаўнога ўбору замужніцы ў доме маладога.

Здыманне гэтага палатна звычайна праходзіць ужо пад час застолля ў доме маладога адразу па прыездзе маладых. Часцей за ўсё робіць гэта маці маладога - вёскі Опаль, Махро, Кліменцінава, Моталь Іванаўскага р-на, Бездзеж Драгічынскага р-на, Медна Брэсцкага р-на, Старое Сяло Жабінкаўскага р-на' ' ̂̓.
У вёсках Альпень, Хорск, Беражное Столінскага р-на, Пагост Жыткавіцкага р-на пакрывала з нявесты здымаў свёкар [9, ф. 6, воп. 3, спр. 10, л. 35; 11, с. 401; 24, с. 37; 27, с. 156], у вёсках Струга Столінскага р-на, Лемешэвічы Пінскага р-на - хросны бацька маладога[3] [24, с. 37]. У Альпені і Лемешэвічах разам з бацькам і хросным рэспандэнты называюць таксама брата жаніха [24, с. 37]. Часцей адзначаецца здыман-не палатна, альбо нават вэлюма, галоўным сватам з боку жаніха (дружкам) - у вёсках Аніскавічы Кобрынскага р-на, Дружылавічы, Буса Іванаўскага р-на, Сварынь Драгічынскага р-на[2,3] [17, с. 275]. Нарэшце, лакальна адзначаецца, што палатно гэтае здымае з маладой музыкант - вёскі Парэчча Пінскага р-на, Дастоева, Вулька Дастоеўская[3]. Цікава, што паўсюдна, дзе пакрывала здымае мужчына, абавязкова адзначаецца, што ён гэта робіць пры дапамозе якога-небудзь прадмета - палкі (вёскі Буса, Сварынь, Альпень), чапялы (вёска Хорск), віл для чыгуноў (вёска Беражное), верацяна (вёска Струга), пугі альбо смыка (вёскі Пагост, Лемешэвічы), музыкант здымае палатно «булавою» ад бубна.

Гэтае пакрывала накідвалі на маці мападога (калі здымаў хто-небудзь іншы) - напрыклад, у вёскі Вулька Дастоеўская, Пясчаная, Буса, Дружылавічы, Моладава Іванаўскага р-на, Сварынь Драгічынскага р-на. Калі-нікалі гэтае палатно адначасова было падарункам свекрыві ад нявесткі (вёска Дружылавічы Іванаўскага р-на) [17, с. 264]. Аднак у кантэксце прыняцця мападой у сям'ю больш значным з'яўляецца танец маці маладога з гэтым пакрывалам. Часцей за ўсё адзначаецца, што маці «скача» з пакрывалам адна (вёскі Вулька Дастоеўская, Дружылавічы). У вёсцы Пясчаная Іванаўскага р-на пад «покрывало на свокроў кідають, да ўжэ танцують мо дэсеть баб пыд тым покрывалом»[3]. Інфармант з вёскі Опаль Іванаўскага р-на распавядае аб зняцці пакрывала наступным чынам: «за столом у молодого ўжэ співають: «Ужэ нашой молодыцы // Надокучыло ў тэмніці // Трэба йій простір даты // Покрывайло зняты». Музыкант іграе. Скачуть з ім чоловік 20»[3]. У вёсцы Ападзішча Іванаўскага р-на свякроў накідвала на сябе пакрывапа і так танцавала з нявесткаю[3].

Пасля танца альбо адразу пасля «скрывання» маці маладога закідвала пакрывала на печ (вёскі Бездзеж Драгічынскага р-на, Пясчаная, Буса, Дружылавічы Іванаўскага р-на)[13] [17, с. 264]. Цікава, што ў вёсцы Кліменцінава Іванаўскага р-на на печ закідвалі і хустачку, у якой маладая прывозіла ад сваёй маці жыта, каб пасыпаць у гаспадарстве свекрыві[1]. Інфармантка з вёскі Лемешэвічы Пінскага р-на паведамляе, што палатно, якім была акутана нявеста, бацька хросны альбо брат маладога сам нясе на смыку на печку альбо за печку [24, с. 37]. Адразу пасля зняцця намігкі закідвалі яе на грубку і ў вёсцы Беражное Столінскага р-на [27, с. 156].

Як рытуалы ўваходжання-прыняцця могуць быць разгледжаны дары нявесты радне жаніха, аб якіх была гаворка вышэй. Падобнае значэнне яны маюць ва ўсіх лакальных варыянтах, незалежна ад таго, на якім этапе абраду адбываецца гэтае дарэнне, праходзіць у некалькі этапаў альбо адбываецца адзін раз і г.д. Адно несумненна, палатняныя (традыцыйна) вырабы, зробленыя ўласнаручна нявесгай альбо яе маці (ва ўсякім выпадку, прадстаўніцамі дому), з якімі дзяўчына выходзіла замуж, падараваныя новым сваякам мелі служыць, між іншым, сродкам «асваення» іх нявестай, а прынящце стараной маладога гэтых дароў сведчыла аб іх жаданні прыняць і саму нявесту [пар.: 28, с. 216].

З асваеннем нявестай новай жыццёвай прасторы і ўключэннем маладой жанчыны ў новую для яе сістэму сваяцкіх сувязяў, а таксама сістэму сацыяльных сувязяў на новым узроўні (у якасці замужніцы) звязаны цэлы цыкл рытуалаў, што датычыў выканання нявесткай у рамках вяселля альбо адразу пасля яго заканчэння шэрагу дамашніх работ і сутыкнення яе з новым асяроддзем, дзе ёй наканавана было працаваць «увесь век». Чыннасці гэтыя былі звязаны з асноўнымі дамашнімі жаночымі справамі.

У беларускай этналогіі для азначэння гэтай групы рытуалаў прыняты тэрмін «выпрабаванні», што Л.А. Малаш вызначае як «вясельны абрад, у час якога правяралі здольнасці і характар мападой, а таксама знаёмілі яе з гаспадаркай і будучымі абавязкамі ў новай сям’і» [29, с. 120].

Такім чынам, выпрабаванні гэтыя можна ўмоўна падзяліць на дзве групы: асабіста выпрабаванні нявесты (яе характару, гаспадарчых здольнасцей), а таксама далучэнне маладой да новай гаспадаркі. Паказальна, што калі выпрабаванні першай групы маглі праходзіць пры сустрэчы маладых у доме бацькоў маладога (звычайна па дарозе ад варот да парога хаты), то другая група, звязаная з уваходжаннем у новую гаспадарку, бывала пасля першай шлюбнай ночы, а ва ўсялякім разе пасля зняцця вянка.

Сведчанні аб раскідванні дроў на падворку пры сустрэчы маладых знаходзім у матэрыялах з вёсак Пласток Жыткавіцкага р-на, Пігасы Драгічынскага р-на'. Вось як апісвае гэты момант абраду інфармантка з вёскі Пласток: «Это называлос - провералі молоду. Молодой сьвокруха ўсегда накідае полення на дорозі. Як невестка пэрэступіла да пошла й пошла, то каге ўге плоха хозяйка. А еслі нагнуласа да попрыбірала, то ўге каге гэто хозяйка хороша»[1].

Пасля зняцця вянка (пазней вэлюму) адбывалася рытуальнае хаджэнне па ваду да калодзежа (зафіксавана ў вёсках Парэ, Дастоева Іванаўскага р-на, Кротава Пінскага р-на, Верхні Церабяжоў, Гарадная Столінскага р-на, Грушава Кобрынскага р-на)[1,3] [4, с. 488; 17, с. 46]. Часта адсыланне за вадой, якое, несумненна, павінна было служыць азнаямленню маладой з новымі абавязкамі і асяроддзем, мела яшчэ дадатковую функцыянальную нагрузку - выпрабаванне характару маладой, якая павінна была прылюдна пераадолець перашкоды, што чынілі ёй новыя сваякі. У апісанні вяселля з вёскі Дастоева знаходзім наступныя звесткі: «Як вэлёна знымуть, то пошлюць по воду. Постаўлять вэдро порванэе»[3]. А вось апісанне з вёскн Парэ: «Знімаюць фату, як прывозяць, хустку нав’язваюць. Дале молодые ідуць до колодзежа, вона чэрпае воду, а вон выліваець, это шчоб вона работала. Тры раза вона будзе наліваць, а вон усё ногою ў вэдро. А потом усё. І вона несёт у хату тую воду»[3].

У большасці апісанняў адзначаецца, што «хаджэнне за вадой» адбывалася пасля «клеці». «Хаджэнні» гэтыя звычайна мелі рытуалізаваны характар, як, напрыклад, у вёсках Струга Столінскага р-на, Вулька Дастоеўская Іванаўскага р-на, Вулька Антопальская Драгічынскага р-на, Азершчына Рэчыцкага р-на[3] [9, ф. 7, воп. 1, спр. 879, л. 35а]. Вось як апісвае хаджэнне маладой да студні пасля «буджэння» інфармантка з вёскі Вулька Дастоеўская: «А молодая озьмэ ўжэ вэдро воды - бэжыть до колодяза, налывае вэдро. А молоды ўжэ бэжыть, да озьмэ да пэрэкыне, вылле тую воду, своволять так коло колодяза. А дале молодая озьмэ поўнэ вэдро, прынэсэ ў хату, чы ўдвох ужэ нэсуть»[3].

У вёсцы Струга традыцыйнае хаджэнне да студні адбывалася наступным чынам: «Як поснедаюць, да ідуць до колодзежа. Бэрэ молодая воду, ту воду нэсуть у хліў, уліваюць у хліў, коб вона была шчасліва. Колісь, як вона нэсправэдліва ўжэ, то нэ ллють, колі вона нэ спэвала “Каліну”. А як нэсправедліва, то воду розліваюць, кубкамі обліваюцца, шуцяць»[3].

Яшчэ адной рытулізаванай формай выпрабаванняў было падмятанне хаты. Пры гэтым госці, што знаходзіліся ў гэты час у хаце, перашкаджалі маладой рабіць сваю справу, раскідвалі смецце, часам кідалі на падлогу дробныя манеты (вёска Налезнікі Жабінкаўскага р-на)[1] [9, ф. 7, воп. 1, спр. 879, л. 35а].

У палескай традыцыі першай паловы XX ст. выпрабаванні гэтыя ў рытуалізаванай форме захаваліся не паўсюдна. У многіх вёсках падмятанне хаты, прынясенне дроў, хаджэнне па ваду праходзіла па-за абрадавымі дзеяннямі і пададзена інфармантамі як простае выкананне звычайнай жаночай працы, якую

нявестка павінна была выконваць ад гэтага часу штодзённа. Такога кшталту сведчанні паходзяць з вёсак Жыткавіцкага р-на: Ляхавічы (прынясенне дроваў і вады, падмятанне хаты), Пухавічы (падмятанне хаты), Людзеневічы (прынясенне вады), Знаменка (прынясенне дроў і вады); Гальцы Столінскага р-на (падмятанне хаты і прынясенне вады); Налезнікі Жабінкаўскага р-на (прынясенне вады і дроў)[1].

У XIX ст., відаць, дзеянні маладой нявесткі пасля клетнага рытуалу былі больш рэгламентаванымі, У вёсцы Рудск (зараз Іванаўскі р-н), па сведчанні Г. Чахоўскай, пасля завівання «маладыя прыносяць са студні вядро вады: палавіну яе выліваюць у дзяжу, астатнюю ставяць на стол для піцця замест віна. Гэта азначае, што яны ўжо самі гаспадары» [12, с. 318]. У П.В. Шэйна мы знаходзім наступнае апісанне (з вёскі Верасніца, зараз Жыткавіцкі р-н); «Невеста ўстае із кроваці, ускаківае на двор, где набірае лоно дров, несець в хату і там бросів дрова, бере ведро і ідзе за водой. Прынесші воды, пече ладзі (бліны), а вся беседа в это время танцуець в сенях і на дворе под ігрой музыканта» [30, с. 423].

Сведчанні аб дачыненні нявесткі да гатавання стравы ў першы пасля шлюбнай ночы ранак знаходзім мы і ў больш позніх матэрыялах. У вёсцы Азершчына Рэчыцкага р-на маладая пякла бліны [8, с. 208], а ў вёсцы Ляхавічы Жыткавіцкага р-на - мясіла хлеб'.

У цэнтральным Палессі зафіксаваны звычай, паводле якога маладая нявестка цэлы тыдзень пасля шлюбу нічога не рабіла ў доме свёкраў, што можа разглядацца таксама ў кантэксце ўваходжання ў новую прастору, «асваення» гэтай прасторы, аднак з захаваннем дыстанцыі на першых яго этапах. Прафанацыя абрадавых дзеянняў, страчванне калісьці актуальнага сэнсу, і ў гэтым выпадку прыводзіць да сцірання межаў паэтапнага ўваходжання новага члена ў сямейна-гаспадарчую супольнасць. Гак, ужо ў міжваенны перыяд выкананне звычаю адмежавання нявесткі на тыдзень ад хатніх спраў у вёсцы, дзе гэты звычай быў зафіксаваны, не лічылася абавязковым. Як адзначаюць інфарманты, «нэвіста нычого нэ робыла нэділю, апе як свекруха нэдобра, то ўсе зразу робыла» (вёска Плотніца Столінскага р-на)[1].

Паступовы працэс складвання роднасных адносін паміж сем'ямі бяручых шлюб падкрэсліваецца і з'яўленнем на заключных этапах вяселля новых «чужых» - удзельнікаў абрадавых пераапрананняў. Вясельныя пераапрананні, як і большасць іншых частак гэтага абраду, выконвалі адразу некалькі функцый. Па-за грунтоўна разгледжанай ў літаратуры сувяззю гэтых своесаблівых «карнавалаў» з магічнымі практыкамі, накіраванымі на ахову вясельнай прасторы і ўдзельнікаў вяселля ад злых сіл, а таксама забеспячэння плоднасці маладых і спору ў гаспадарцы, з'яўленне пераапранутых менавіта на заключных этапах вяселля дазваляе меркаваць аб працістаўленні ўдзельнікаў гэтых «карнавалаў» астатнім гасцям, што зблiжала партыі жаніха і нявесты ў новай якасці.

Разгорнутасць гэтых рытуалаў нарастае з захаду на ўсход даследуемага рэгіёну. На захадзе Брэстчыны ўзгадваюцца толькі пеаапрананні ў цыганоў пад час пярэзваў (прыезду партыі маладой у дом маладога); «як ідуть у пэрэзвы, то пэрэодеваццям цыганамі. Ходылі, бралі продукты» (вёска Налезнікі Жабінкаўскага р-на)[1]. У гэтым арэале сустракаюцца вёскі, у якіх звычаю пераапрананняў не было (вёска Кабёлка Брэсцкага р-на) [9, ф. 7, воп. 1, спр. 879, л. 26].

Далей на ўсход да тэрыторыі Петрыкаўскага і Лельчыцкага р-наў пераапрананні насілі больш разгорнуты характар, аднак пераважна ўяўлялі сабой толькі эпізод у складзе іншых рытуалаў. Канкрэтнае выкананне гэтага эпізоду даволі моцна вар'іруецца ў асобных лакальных традыцыях. У азначаных арэалах пераапрананні могуць насіць як спецыяльную назву - «цыганы» (вёскі Хомск, Перкавічы, Бездзеж Драгічынскага р-на, Кліменцінава, Пясчаная, Буса, Моладава Іванаўскага р-на)[1], «попредухі» (вёскі Лядавічы, Вулька Дастоеўская, Пясчаная Іванаўскага р-на)[3], «хвасты» (вёскі Ападзішча, Махро Іванаўскага р-на)[3], так і нё мець тэрміналагічнага азначэння (вёскі Азераны, Знаменка Жыткавіцкага р-на, Струга, Гарадная Столінскага р-на, Вулька Антопапьская, Пігасы, Ліпнікі Драгічынскага р-на, Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на, Дружылавічы Іванаўскага р-на, Сякерычы, Колкі Петрыкаўскага р-на)[3,9] [9, ф. 7, воп. 1, спр. 879, л. 34; ф. 8, воп. 83, спр. 211, сш. 1, лл. 17, 84; 17, с. 278 - 279].

У апошнім выпадку інфарманты адзначаюць, што на пэўным этапе частка вясельнікаў пераапраналася «у цыганоў», хаця тытульныя персанажы не былі адзінымі ў гэтым прадстаўленні. Распаўсюджанымі былі пераапрананні ў «доктара», «папа», «салдата», а таксама абрадавая (апрананне мужчын «бабамі», а жанчын «мужыкамі»); апраналіся ў касцюмы «цыгана» і «цыганкі», а таксама «маладой» і «маладога».

Вось як апісвае пераапрананні адна з інфармантак з вёскі Кліменцінава: «у цыганоў пэрэдэвалыся, як ужэ молодую забэруть, то тому ріду нэма шчо робыты, то ходять по хатах. Колысь як пэрэдэвалыся, то сцiснялысь: людэй сцiснялысь, дэтэй, а тэпэра цыганы, то абышчо роблять. А раньшэ - то цыган, цыганка, молоду робылы: мужык які нарадзіцца. У його ногі нэзагараны, а ёму юбку наложать, да тыі ногы такы смішныі. Цыганы ідуть, набэруть водкі, закускі, да кого бачать - поять, кормять. Пэрэдэвалыса з обоіх родоў, як ділять коровая, бо то кончылас уся робота, одно цыганы осталіс»'.

Цікавы звычай існаваў у шэрагу вёсак Драгічынскага і Іванаўскага р-наў, дзе «цыганы» «адводзілі маладую». Так выглядала гэтая частка абраду ў вёсцы Бездзеж: «На трэті дэнь солом'янку вэзуть - то

ўжэ цыганы. Од жэныха до невесты. «Молодую одвозять». Кажуть: «Молодая негодяшча». Убэруть яку бабу ў жэныха, а мужыка ў молоду, да вэзуть, солом'янку мокру по зэмлі тягнуть - у мэшок сіна напхають... Много выроблялы. Сінныка того тягнуть - гэто «молоду ўсцяну одвозять». А родня, як успіе, то двэры замкнуть, коб не ўтяглы того сінныка»[1].

Некалькі інакш выглядалі пераапрананні ва ўсходнепалескіх вёсках. Тут найболей яскрава праступае сувязь пераапраняў з магічнымі практыкамі, накіраванымі на забеспячэнне плоднасці маладых, што пацвярджаецца не толькі ярка выражаным эратычным зместам гэтых рытуалаў, але і пачаткам іх у некаторых вёсках адразу пасля пакладзін. Пераапрананні тут часта носяць характар разбудаваных відовішчаў, на якія адводзіцца нават асобны дзень, што, аднак, сустракаецца не паўсямесна. Напрыклад, апісанне з вёскі Тульгавічы Хойніцкага р-на падобна на апісанні «маскарадаў» з цэнтральных рэгіёнаў Беларускага Палесся: «як падзеляць каравай (у маладога), шчэ трохі пагуляюць, пасняваюць. Патом некаторыя передзяваюцца цыганамі і ідуць па сялу. Ох, што ўжэ яны выдзелуюць. У хаты заходзяць, крадуць яду, могуць каўры пазнімаць, курэй пакрадуць. Гуляюць, спяваюць, дурэюць. Добрэ гуляюць» [5, с. 92].

Своеасаблівай з'яўляецца і тэрмінапогія для абазначэння гэтай часткі абраду. Сустракаецца тут і назва «цыганы» (вёскі Савічы, Калыбань Брагінскага р-на, Стралічава Хойніцкага р-на) [5, с. 8, 22, 29]. Увогуле пераапрананні ў «цыганоў», а таксама ў «бабу» і «дзеда» тут даволі распаўсюджаны. Аднак пераапрананні гэтыя цесна пераплецены з рытуламі паядання курыцы ці іншай спецыяльна прыгатаванай жывёліны, а таксама з так званымі «шутачнымі вяселлямі» - прадстаўленнямі, у камічнай форме паўтараючымі некаторыя вузлавыя моманты вяселля.

Аб пераапрананнях і паяданні курыцы, што спадарожнічала ім, мы знаходзім звесткі ў матэрыялах з вёсак Дарашэвічы, Галубіца (зараз - Петрыкаўскі р-н), Дзякавічы (зараз - Жыткавіцкі р-н), змешчаныя ў працы К. Машыньскага «Усходняе Палессе» [13, с. 194, 199, 208]. Зафіксаваны гэтыя рытуалы таксама ў вёсках Глінішчы, Радзін, Тульгавічы, Слабажанка Хойніцкага р-на, Залессе Брагінскага р-на, Валаўск, Кочышча, Казлы, Сугакі Ельскага р-на, Ровенская Слабада, Азершчына, Капань, Жмураўка, Будка Рэчыцкага р-на, Галоўчыцы Нараўлянскага р-на, некаторых вёсках Гомельскага р-на [5, с. 31, 77 - 78, 83 - 84, 92; 8, с, 166, 183, 201; 9, ф. 8, воп. 81, спр. 184, сш. 2, лл. 79-81; 25, с. 436; 31, 58 - 59; 32, с. 357].

У некаторых вёсках Рэчыцкага р-на пераапранутыя госці ішлі за прыданым нявесты, а па дарозе «сабіралі» курэй (вёскі Жмураўка, Будка) [8, с. 183, 201]. На Нараўляншчыне, як піша К. Кабашнікаў, «у панядзелек збіраюцца "на кашу" - вараць кашу, пераапранаюцца ў дзеда, бабу, цыганоў, выкупляюць кашу» [18, с. 411].

Распаўсюджанне «шутачных вяселляў», верагодна, не выходзіць за рамкі арэала ўсходняга Палесся. Зафіксаваны яны ў вёсках Слабажанка, Глінішчы Хойніцкага р-на, Сякерычы Петрыкаўскага р-на, Людзеневічы Жыткавіцкага р-на, Валаўск, Кочышча Ельскага р-на, Галоўчыцы Нараўлянскага р-на, Ровенская Слабада, Капань, Маканавічы Рэчыцкага р-на. У Валаўску і Кочышчах этап гэты вядомы пад назвай «хвост» [5, с. 61; 31, с. 58].

У вёсках Слабажанка, Глінішчы, Маканавічы маскарады вядомы як гульні ў «зайца» [8, с. 223; 9, ф. 7, воп. 1, спр. 881, лл. 25 -25а; ф. 8, воп. 81, спр. 184, сш. 2, л. 79]. Вось як апісвае гэты рытуап адзін з інфармантаў з вёскі Слабажанка: «Пасля заканчэння вяселля ў маладой (зрукі маладога), і ў маладога (з рукі маладой) гуляюць у «зайца». За маладую адзяваюць "шутлівую" жанчыну і мужчыну за маладога. Надзяваюць вянок, зроблены з палявых красак, прышываюць замест кветкі розгу з веніка, замест свечкі дзяркач дзіравы. Садзяць іх на куце, зводзяць іх і цалавацца, як і маладых, у сажу вымазваюць. Даруць: гарбузы выражуць, падмазку, што скавараду мажуць - гэта пудраніца, засланку - гэта люстра. Скруцяць ляльку з трапак - гэта ты бярэш жонку з прыданым - байбуком. Выходзяць на вуліцу і крычаць: Паймаем зайца, паймаем. Адзін бярэ стрэльбу і страляе, заяц падае: ці "малады", ці "маладая". А тады ўжо прыходзяць да лупяць таго зайца. Ужо ложаць на стол - ратаваць зайца. Стараюцца падвесці мужчыну, які не ведае гэтага звычаю. А зайцу даюць гарэлкі ў рот, ён дзяржыць. Як толькі падыходзіць хто "ратаваць", то заяц прысне яму ў твар, вочы гэтаю гарэлкаю. Потым зноў ідуць у хату - гэта ж убілі зайца, трэба замачыць. У панядзелак, пасля заканчэння вяселля адны свахі гатуюць ежу, прадукты к гэтаму зайцу, а другія пераапранаюцца ў цыганскае адзенне, бяруць маскі (капронавыя шкарпэткі, каб не пазналі), сумкі, кашы бяруць, ідуць па хатах. Людзі дараць, кур ловяць. Усё гэта сцягаецца на вясельны двор» [9, ф. 8, воп. 81, спр. 184, сш. 2, лл. 79 - 81].

У вёсцы Ровенская Слабада Рэчыцкага р-на ўвесь маскарад абазначаўся назвай «курэй драць» [8, с. 183], а ў вёсцы Капань таго ж раёна, а таксама Радзін Хойніцкага р-на - «пятухі» [5, с. 83 - 84; 8, с. 166].

У некаторых вёсках маскарады і паяданне курыцы (альбо іншай жывёліны) прадстаўляюць сабой асобныя рытуалы, якія не толькі абазначаюцца рознымі назвамі, але адстаяць адзін ад аднаго ў часе. Напрыклад, у вёсцы Зашчоб'е Рэчыцкага р-на маскарады ладзіліся пад час дзялення караваю маладога, а

«курэй дралі пазней» [8, с. 162 - 163]. У Галоўчыцах Нараўлянскага р-на «куру» гулялі ў доме бацькоў маладога праз тыдзень пасля вяселля [5, с. 78].

Падобныя ўскладненні структуры абраду выкліканы, відавочна, спецыфікай фарміравання лакальных традыцый, якія яшчэ ў першай палове XX ст., калі гаворка ідзе аб абрадах, характарызаваліся даволі вялікай ступенню замкнутасці. Патрэбна адзначыць, што ў другой палове XX ст. гэтыя этапы вяселля не рэдуцыравалі, а, наадварот, дапаўняліся і разбудоўваліся. Разам з тым, трацячы сваё былое сімвалічнае значэнне, яны ператварыліся проста ў яскравыя ўвесяленні, лакапьныя адрозненні якіх падкрэслівалі «рэгіянальны каларыт» шлюбнай цырымоніі.

Лакалізацыя і склад удзельнікаў маскарадаў таксама вар'іраваліся ў залежнасці ад рэгіянальнай і лакальнай традыцыі. Найчасцей упамінаецца варыянт, калі прадстаўнікі партыі маладога пераагіранаюцца і ідуць да цешчы - «адвезці маладую», забраць прыданае альбо «завезці цешчы падарункі» - вёскі Глінішчы, Стралічава Хойніцкага р-на, Савічы, Малейкі Брагінскага р-на, Жмураўка, Будка, Азершчына Рэчыцкага р-на, Колкі, Сякерычы, Снедзін Петрыкаўскага р-на, Струга Столінскага р-на, Вулька Дастоеўская, Пясчаная, Лядавічы, Махро Іванаўскага р-на, Хомск, Бездзеж, Ліпнікі, Перкавічы, Пігасы Драгічынскага р-на, Налезнікі Жабінкаўскага р-на[1,3] [5, с. 8, 22; 8, с. 201, 205, 209; 9, ф. 7, воп. 1, спр. 883, лл. 25, 36а; ф. 8, воп. 83, спр. 211, сш. 2, лл. 86 - 87, сш. 1, л. 17].

Другі варыянт - пераапраналіся прадстаўнікі партыі маладога, але ладзілі відовішча ў «сваім» локусе - пад час дзялення караваю альбо пасля яго, пад час прыезду «прыдання» альбо «перазвян», пасля ўсіх вясельных цырымоній (вёскі Людзеневічы, Знаменка Жыткавіцкага р-на, Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на, Капань, Зашчоб'е Рэчыцкага р-на, Гарадная Столінскага р-на, Галоўчыцы Нараўлянскага р-на)[1] [5, с. 78; 8 с. 163, 166].

У вёсках Дружылавічы Іванаўскага р-на, Камень Пінскага р-на, Велута Лунінецкага р-на, Балажэвічы Мазырскага р-на, некаторых вёсках Гомельскага р-на маскарад ладзілі «перазвяне» ці «прыданыя» - прадстаўнікі партыі маладой [17, с. 278 -- 279; 32, с. 357; 33, с. 330 - 331].

Яшчэ адзін варыянт - калі маскарады і рытуальнае паяданне курэй ладзяць напрыканцы вяселля ў абодвух вясельных дамах асобна. Пры гэтым вясельнікі абедзвюх партый маглі хадзіць ад аднаго вясельнага дому да другога. Гэты варыянт прысутнічае ў матэрыялах з вёсак Слабажанка, Радзін Хойніцкага р-на, Ападзішча Іванаўскага р-на, Залессе Рэчыцкага р-на, Валаўск Ельскага р-на[3] [5, с. 30, 61, 83 - 84; 9, ф. 8, воп. 81, спр. 184, сш. 2, лл. 79 - 81]. Патрэбна адзначыць, што ў некаторых вёсках (напрыклад, у Радзіне) вясельныя патрыі ладзілі гульні кожная у «сябе», тады як у іншых (напрыклад, у Слабажанцы) вясельнікі «з рукі маладой» гулялі ў доме маладога, а вясельнікі «з рукі маладога» - у доме бацькоў маладой [5, с. 83 - 84; 9, ф. 8, воп. 81, спр. 184, сш. 2, лл. 79 - 81].

Складванне сваяцкіх су'вязей у палескім вясельным абрадзе завяршаюць адведванні маладымі с.ваякоў пасля заканчэння асноўных рытуалаў абраду, а таксама ўзаемныя наведванні прадстаўнікоў дзвюх сямей. Спачатку маладая пара з прадстаўнікамі сям'і маладога наведвае бацькоў маладой замужніцы, а потым (што не было абавязковым) прадстаўнікі яе сям'і наведваюць маладую пару ў доме бацькоў мужа.

У большасці вёсак даследуемай тэрыторыі абавязковым было гасцяванне праз пэўны час (праз тры дні альбо праз тыдзень) маладой пары з родзічамі мужа ў бацькоў жонкі (калі маладая першы раз пасля вяселля наведвае родны дом). Часта гэтае гасцяванне дублюецца ў родным доме маладога: зафіксавана ў вёсках Кабёлка Брэсцкага р-на, Заазернае Маларыцкага р-на, Аніскавічы Кобрынскага р-на, Пігасы, Перкавічы, Ліпнікі, Вулька Антопальская Драгічынскага р-на, Махро, Моталь Іванаўскага р-на, Знаменка, Ляхавічы, Людзеневічы, Ленін Жыткавіцкага р-на, Дарашэвічы Петрыкаўскага р-на, Скароднае Ельскага р-на[1,3] [5, с. 78; 9, ф. 6, воп. 3, спр. 10, л. 12; ф. 7, воп. 1, спр. 879, лл. 21а, 26, 35а; 13, с. 195]. Натое, што звычай гасцявання таксама ў доме маладога існаваў і ў XIX ст. указваюць матэрыялы з вёскі Верасніца (зараз - Жыткавіцкі р-н), прыведзеныя П.В. Шэйнам: «у нашых сялян таксама бываць свае візіты, вядомыя пад назвай "пірагоў", таму што яны вязуць з сабою пірагі ці проста хлеб. Спачатку едуць да бацькоў маладое, а ў наступную нядзелю апошнія прыяжджаюць да іх» [30, с. 443].

Гасцяванні ў абодвух дамах найчасцей абазначаюцца тэрмінам «гасціна» («госці», «гостына»). Назва гэта зафіксавана ў большасці вёсак заходняй і цэнтральнай частак Беларускага Палесся, а таксама ў некаторых мясцовасцях усходняга Палесся. У цэнтральным Палессі вылучаецца зона, дзе гэтыя гасцяванні носяць назву «пірагоў». Тэрмін зафіксаваны ў вёсках Струга, Плотніца, Гальцы, Гарадная Столінскага р-на[1,3]. П.В. Шэйн адзначае яго бытаванне ў XIX ст. на Тураўшчыне (вёска Верасніца, сучасны Жыткавіцкі р-н) [30, с. 443].

Для абазначэння паслявясельных візітаў ужываўся і тэрмін «пярэзвы» - вёскі Заазернае Маларыцкага р-на, Ляхавічы Жыткавіцкага р-на, Заходы Рэчыцкага р-на' [8, с. 192; 9, ф. 7, воп. 1, спр. 879, л. 21а].

Ва ўсходнім Палессі сустракаюцца і іншыя назвы для гэтага этапу абраду. У некаторых вёсках Нараўлянскага р-на ён насіў назву «красная гарэлка» і адбываўся толькі ў бацькоў маладой [18, с. 411].

У вёсцы Скароднае Ельскага р-на Т.А. Кухаронак зафіксаваны тэрмін «старая бяседа» [9, ф. 6, воп. 3, спр. 10, л. 12].

У некаторых вёсках існаваў звычай адведзін маладых праз тыдзень пасля вяселля, што магло насіць назву «пярэзвы» (вёска Заходы Рэчыцкага р-на) [8, с. 192]. У вёсцы Галоўчыцы Нараўлянскага р-на праз тыдзень пасля вяселля ў доме бацькоў маладога ладзілі «куру», дзе прысутнічалі самыя блізкія родзічы маладой і амаль усе, хто гуляў на вяселлі з боку маладога [5, с. 78]. У вёсках Залессе Брагінскага р-на, ГТракісель Рэчыцкага р-на праз тыдзень пасля вяселля маці маладой прыходзіла праведаць дачку [5, с. 30; 8, с. 213]. У вёсцы Маканавічы Рэчыцкага р-на «на другую нядзелю зяць вязе ў госці цешчу. Абувае, прыбірае, патанцуе зяць з цешчай, абуе яе ў пасталы» [8, с. 223].

Хаджэнне маладой пары ў госці да іншых сваякоў прынята было не паўсюдна. Зафіксавана яно ў вёсках Струга Столінскага р-на, Аніскавічы Кобрынскага р-на, ёсць звесткі аб існаванні гэтага звычаю ў некаторых вёсках Лунінеччыны[2-5] [34, с. 177]. Можна меркаваць, што падобныя візіты ў папярэднія часы былі больш распаўсюджаны, што звязана было з большым значэннем сваяцкіх і кроўных сувязей у жыцці вясковай сям'і і неабходнасцю ўваходжання маладой пары ў вясковую грамадскасць у новай якасці.

Такім чынам, не з'яўляючыся асноўнай функцыяй вясельнага абраду, складванне сваяцкіх адносін прасочваецца ў многіх асноўных рытуалах палескага вяселля другой паловы XIX - першай паловы XX ст. і на разглядаемы перыяд уяўляе сабой значную лінію ў даследуемым абрадзе.

## ЛІТАРАТУРА


1. Obrebski I. Polesie archaiczne- Warczawa 1944. - 198 s.
2. Jelenska E. Wies' Komarowicze w pow. Mozyrskim // Wis1a. - 1891. -T. V. - 8. 290 - 331,479 - 590.
3. Пашкова Г.Т. Етнокультурні зв'язкн украі'нців та білорусів Полісся. На матеріалах весільноі' обрядовості. - Кнів: Наукова думка, 1978. - 120 с.
4. Яцкевіч Т.Дз. Традыцыйныя заняткі насельніцтва // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Кобрынскага раёна. - Мн.: БЕЛТА, 2002. - С. 477 - 492.
5. Абрадавы фальклор гомельскага Палесся / Рэд. і ўступны арт. В.С. Новак. - Гомель: Гомельскі цэнтр навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармцыі, 1998. - 139 с.
6. Бандарчык В.К. Агульныя рысы і рэгіянальныя асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва беларуска-украінскага Палесся // X Міжнар. з'ездз славістаў. - Мн.: Навука і тэхніка, 1988,-26 с.
7. Святы і абрады Берасцейшчыны / Уклад. Р.І. Тарашкевіч. - Мн., 1992. - 43 с.
8. Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна. /Уклад. І.Ф. Штэйрнер, В.С. Новак. - Мн.: Неман, 2002. - 383 с.
9. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі.
10. Гура А.В. Опыт выявлення структуры севернорусского свадебного обряда (по матерналам Вологодской губ.) / Русскнй народный свадебный обряд. Нсследовання н матерналы; Под. ред. К.В. Чнстова н Т.А. Бернштам. - Л.: Наука. - С. 72 - 88.
11. Тураўскі слоўнік: У 5-ці т. Т. 5 / Склад. А.А. Крывіцкі, Г.А. Цыхун, І.Я. Яшкін і інш. - Мн.: Навука і тэхніка, 1987. -423 с.
12. Вяселле. Абрад / Уклад., уступны арт. і камент. К. Цвіркі; Муз. дадатак З.Я. Мажэйка; Рэд. В.К. Бандарчык, А.С. Фядосік. - Мн.: Навука і тэхніка, 1978. - 640 с.
13. Moszynski K. Polesie Wschodnie: Materjaly etnograficzne z wschdniej czesci powiatu mozyrskiego oraz z powiatu rzeczyckego. - Warszawa: Wydawnictwo kasy im. Mianowskiego, 1928. - 328 s.
14. Гура А.В. Мз полесской свадебной термннологнн. Свадебные чины // Славянское н балканское языкознанне: Язык в этнокультурном аспекте: Словарь: Б - М. - М.: Наука, 1984. - С. 137 - 178.
15. ГураА.В. Нз полесской свадебной термннологнн. Свадебные чины // Славянскнй н балканскнй фольклор. Духовная культура Полесья на общеславянском фоне: Словарь: Н - Свашка. - М.: Наука, 1986.-С. 44- 177.
16. Тураўскі слоўнік: У 5-ці т. Т. 4 / Склад. А.А. Крывіцкі, Г.А. Цыхун, І.Я. Яшкін, П.А. Міхайлаў. - Мн.: Навука і тэхніка, 1985. - 360 с.
17. Палескае вяселле / Уклад. і рэд. В.А. Захаравай. - Мн.: Універсітэцкае, 1984. - 303 с.
18. Кабашнікаў К. Вусная народная творчасць Нараўляншчыны // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Нараўлянскагар-на. - Мн.: БЕЛТА, 1998. - С. 407 - 413.
19. Валенцова М.М. Мёд. Нз словаря «Славянскне древности» // Славяноведение. - № 2. - 2001. - С. 64 - 67.
20. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. - Мн.: Беларусь, 2004. - 592 с.

21. Зорин Н.В., Токсубаева Л.С. Обрядовые функции орнаментированных полотенец у русского населения Среднего Поволжья // Этнография марийского и русского населения Среднего Поволжья. Вып. 11. - Йошкар-Ола, 1987. - С. 95 - 105.
22. Токсубаева Л.С. Символика орнаментированного полотенца как атрибута традиционной семейной обрядности русского населения Казанского Поволжья (XIX - начало XX вв.) // Марийский археографический вестник. - 1999. - № 9. - С. 78 - 82.
23. НячаеваГ.Р. Ручнік у абрадах // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Веткаўскага р-на: У 2-х кн. Кн. 2. - Мн.: БЕЛТА, 1998.-С. 13-15.
24. Dqbek K. Plotno w zwyczajach i obrz^dach na terenie Polesia Zachodniego od końca XIX w. do wspólczesności. Praca magisterska napisana pod kierunkiem prof. Mariana Pokropka. - Warszawa, 2001. - 70 s.
25. Новак В.С. Народная творчасць Ельскага раёна // Памяць: Гіст.-дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусь Ельскі раён. - Мн.: Ураджай, 2001. - С. 428 - 438.
26. Фадзеева В. Беларускі ручнік. - Мн.: Полымя, 1994. - 327 с.
27. Сцэнізацыя фальклорных свят і абрадаў / Аўтары-склад. В.С. Новак, Ф.І. Штэйнер. - Мазыр: Белы вецер, 1999. - 172 с.
28. Бернштам Т.А. «Хитро-мудро рукодельице» (вышивание-шитьё в символике девичьего совершеннолетия восточных славян) // Женщина и вещественный мир культуры у народов Европы и России. Сб. МАЭ, Т. XLVII / Сост. Л.С. Лаврентьева, Т.Б. Щепанская. - СПб.: Петербургское востоковедение, 1999.-С. 191 -249.
29. Этнаграфія Беларуси Энцыкл. / Рэдкал. 1.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. - Мн.: БелСЭ, 1989. - 575 с.
30. Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края. Т. 3. - СПб., 1902.-535 с.
31. Тура А.В., Терновская О.А., Толстая С.М. Материалы к полесскому этнолингвистическому атласу // Полесский этнолингвистический сб.: Материалы и исследования. - М.: Наука, 1985. - С. 49 - 152.
32. Новак В.С. Народная творчасць Гомельскага р-на // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Гомельскага р-на: У 2-х кн. Кн. 2-я. - Мн.: БЕЛТА, 1998. - С. 348 - 358.
33. Тура А.В. Из полесской свадебной терминологии. Свадебные чины // Славянский и балканский фольклор. Этнолингвистическое изучение Полесья: Словарь: Свеночельники - Ш) - М.: Индрик, 1995. - С. 318 -334.
34. Жлоба С. І забыта - і не забыта // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Лунінецкага р-на / Укл. Т.В. Канапацкая. - Мн.: Беларусь, 1995. - С. 163 - 188. [*2 3]

[1] Асабісты архіў аўтара.

[2] Асабісты архіў С.П. Жлобы.

[3] Матэрыялы этнаграфічных палявых даследаванняў выкладчыкаў і студэнтаў гістарычнага факуль-тэта Брэсцкага дзярж. ун-та імя А.С. Пушкіна.